на два музеі рэвалюцыйнай тэматыкі, аднак ідэалагічны прэс не дазволіў ім на дастаткова высокім мастацкім узроўні паказаць рэвалюцыйную эпоху, а лёс супрацоўнікаў музея ўвогуле стаў трагічным. Аднак крытычнае асэнсаванне дзейнасці Музея рэвалюцыі з усведамленнем адмоўнага і станоўчага паспрыяла фарміраванню музейнай мадэлі ў пасляваенны час.


1. *Рафиенко Е.Н.* Роль историко-революционных музеев в становлении музейного дела СССР в 1920-е годы // Формы и методы научно-просветительной работы музеев: Сб. науч. тр. – М.: Центральный музей революции СССР, 1986. – С. 71.

2. НА РБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 179. Т. 1. С. 174.

3. Открытие Музея революции // Звезда. – 1926. – 1 мая. – С. 5.

4. НА РБ. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 247. С. 11–19.

5. Там жа. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 11. С. 220.

6. РДАСПГ. Ф. 70. Воп. 2. Спр. 56. С. 18.

7. НА РБ. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 2565. С. 144–166.

8. Там жа. Спр. 48. С. 4–7.

9. НА РБ. Ф. 1367. Воп. 1. Спр. 10. С. 33–35.

10. КДБ РБ. Арх. спр. 17387-С: У 5 т. – Т. 2. – С. 223–239.

11. КДБ РБ. Арх. спр. 5923-С. С. 50–54.

12. КДБ РБ. Арх. спр. 6346-С. С. 46–49.

13. КДБ РБ. Арх. спр. 5899-С. С. 213–216.

14. НА РБ. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 202. С. 18–23.

15. Там жа. Спр. 247. С. 11–19.

16. *Гужалоўскі А.А.* Музеі Беларусі 1918–1941 гг. – Мн., 2002. – С. 60.


*І.В.Кудыбін*

## ПРАБЛЕМА ЎВАСАБЛЕННЯ ІДЭІ СІНТЭЗУ МУЗЫКІ І ВЫЯВЫ Ў МАСТАЦКІМ ТВОРЫ

У гісторыі мастацтваў назіраюцца дзве тэндэнцыі асэнсавання пытання ўзаемадзеяння мастацтваў. Тэндэнцыя да індывідуалізацыі дапаўняецца імкненнем да ўзаемаўплыву і сінтэзу, які выступае як адна з праяў інтэграцыйных грамадскіх імкненняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце “сінтэз мастацтваў” трактуецца вельмі шырока і часта з дапамогай тэрмінаў тыпу “склейванне”, “сімбіёз”, “канцэнтрацыя”, “трансляцыйнае спалучэнне”, якія яшчэ больш містыфікуюць і без таго складаны змест гэтага фенoмена. Сінтэз разумеюць і як сінкрэтычнасць, і як калажнасць, і як механічнае злучэнне розных відаў і жанраў мастацтва. Відавочна, аднак, што сінтэз – гэта не проста арыфметычнае злучэнне розных мастацтваў, але і не іх поўнае, да страты відавой спецыфікі, растварэнне аднаго ў адным, якое ўзнікае як вынік некаторых сучасных фармальна-мастацкіх эксперыментаў.

На сённяшні дзень больш поўна распрацавана пытанне сінтэзу розных мастацтваў і літаратуры: літаратура і кіно, літаратура і тэатр, літаратура і выяўленчае мастацтва (у прыватнасці праблема кніжнай ілюстрацыі), літаратура і музыка (у тым ліку праблема ўвасаблення тэксту ў песні, рамансе, оперы). Разгляду гэтых пытанняў прысвечана вялікая колькасць навуковых прац.

Больш цікавым і менш даследаваным у плане сінтэзу падаецца ўзаемадзеянне выяўленчага мастацтва і музыкі. Цікавасць выклікана тым, што прынцыпы жывапіснага адлюстравання і музычнага выяўлення не толькі адрозніваюцца, але могуць быць і супрацьлеглыя. Першае грунтуецца на зрокавым, другое – на слыхавым успрыманні; выяўленчае мастацтва статычнае і нерухомае, музыка – дынамічная і развіваецца ў часе; першае звязана з узнаўленнем знешняга асяроддзя, другое – з увасабленнем унутранага стану. Разам з тым выяўленчае мастацтва і музыка хоць і рознымі шляхамі, але ідуць да аднаго і таго ж – да стварэння мастацкіх вобразаў, якія праўдзіва адлюстроўваюць рэальнае жыццё і фарміруюць грамадскую свядомасць чалавека і яго асобу.

Музыка і выява аб’ядноўваюцца паміж сабой перш за ўсё на аснове агульнасці зместу: драматургіі ідэй і вобразаў, прадметна-эмацыянальных асацыяцый і інш. Але пры наяўнасці гэтай агульнай змястоўнай асновы значную ролю ў іх сінтэзе маюць пэўныя фармальныя сродкі: рытм, каларыт, спосабы дынамічнага развіцця. У выніку адбываецца сапраўдны мастацкі сінтэз, які ахоплівае як сферу зместу, так і сферу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкай формы.

Ступень узаемадзеяння музыкі і выявы розная. З аднаго боку, сінтэз можа быць створаны як рэакцыя на эмацыянальны водгук ад убачанага, пачутага. З другога – як інтэрпрэтацыя, творчае вытлумачэнне.

У працэсе гістарычнага развіцця мастацтваў музыка ўзбагачала жывапіс, дапамагала пашырэнню яго выразных магчымасцей і сродкаў. Спроба ўвасаблення ў жывапісе музычных твораў і выяўленчай ілюстрацыі музыкі, як правіла, не давала каштоўных вынікаў з-за прынцыповай неперакладанасці музыкі. Але гэтыя спробы адлюстроўвалі пошукі шляхоў сінтэзу мастацтваў, што прыводзіла падчас да цікавых знаходак.

Больш істотную ролю адыгрывала развіццё музычнасці самога жывапісу. Гэта было звязана з узмацненнем у жывапісе тых бакоў яго зместу, якія складаюць аснову музычнай вобразнасці, менавіта эмацыянальна-суб’ектыўнага, лірычнага пачатку. Яго ўзмацненне часта суправаджалася некаторым аслабленнем сюжэтнасці і прадметна-рэчаіснаснага моманту выявы, але разам з тым узрастала змястоўная роля каларыту і рытму ў карціне, што прыводзіла да ўзмацнення яе дэкаратыўных якасцей. У шэрагу выпадкаў музычнасць выяўлялася і ў спробах выкарыстання музычна-кампазіцыйных заканамернасцей.

Не выпадкова аналогіі з музыкай і музычныя эпітэты, якія характарызуюць менавіта жывапісныя прыёмы, дастаткова трывала ўкараніліся ў сучасным мастацтвазнаўстве. Выразы “маляўнічы акорд”, “каляровая гармонія”, “пявучыя лініі”, “музычныя рытмы” і іншыя, як і вобразныя аналогіі з музыкай, мы сустракаем і ў працах мастацтвазнаўцаў, і ў выказваннях мастакоў. Яны адлюстроўваюць сувязі, якія сапраўды існуюць паміж мастацтвамі, уплыў аднаго на другое.

Падобны сінтэз, тым не менш, тоіць і небяспеку. Вызваляючы мастака ад строгай кананічнай рэгламентацыі, сінтэз дае яму такія неабмежаваныя магчымасці, якія не заўжды можна адолець. А гэта прыводзіць да стварэння сурагатаў мастацтва, якія могуць быць падобнымі на з’яву сапраўднага мастацкага сінтэзу.

Небяспечнасць існуе і ў тым, што часам ставяць у адзін

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рад комплексныя імкненні сучаснай навуковай дзейнасці і сінтэз мастацтваў і сцвярджаюць неабходнасць другога за кошт актуальнасці першага. Аднак "сінтэз навук, – як піша Е.Фейнберг, – заўжды можа быць толькі плённы (ці ў горшым выпадку бескарысны). Між тым сінтэз мастацтваў, які дае мастаку новыя магчымасці, тым не менш, часам... можа мець адмоўныя вынікі".

Такім чынам, можна адзначыць, што феномен сінтэзу выяўляецца ў розных адносінах – у развіцці сінтэтычных мастацтваў і ў яднанні розных мастацтваў у агульнай кампазіцыі, у пераводзе аднаго мастацкага рада ў другі і ў выкарыстанні асобнымі мастацтвамі выразных сродкаў, мастацкай мовы і матэрыялу іншых мастацтваў.

На працягу гісторыі мастацтваў сінтэз музыкі і выяўленчага мастацтва, што адбываецца ў разнастайных мастацкіх творах, звяртаў на сябе ўвагу шматлікіх майстроў. Гэта прывяло да неабходнасці тэарэтычнага асэнсавання дадзенага пытання, якое знаходзіць сваё ўвасабленне ў творчасці рамантыкаў і атрымлівае далейшае развіццё. Сучаснае мастацтва ўсё часцей звяртаецца да ідэі сінтэзу, што, безумоўна, патрабуе больш дэталёвай распрацоўкі гэтага феномена і розных праяў яго ў сучасным мастацтве.


1. *Борев Ю.Б.* Эстетика: В 2 т. – 5-е изд.,доп. – Смоленск: Кн. изд-во, 1997.– Т. 1.

2. *Ванслов В.В.* Изобразительное искусство и музыка. – Л.: Художник РСФСР, 1977.

3. *Мурина Е.Б.* Проблемы синтеза пространственных искусств: Очерки теории. – М.: Искусство, 1982.

4. *Современное* искусствознание: методические проблемы / Отв. ред. А.Я.Зись. – М.: Наука, 1994.


*Л.У.Ляўчук*

## КУЛЬТУРНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ: ПРАБЛЕМЫ АРГАНІЗАЦЫІ

Задаволіць эстэтычныя запатрабаванні чалавецтва немагчыма без звароту да сусветнай культурнай спадчыны. Праб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ